УДК 94(44)+94(46)

# ВЕДАЎСТВО І ВЕДЗЬМЫ Ў КРАІНЕ БАСКАЎ У РАННІ НОВЫ ЧАС

*Клімуць Лада Яраславаўна*
дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі МДУ імя А. А. Куляшова
кандыдат гістарычных навук, дацэнт (Магілёў, Беларусь).

***Вера ў ведзьм у Краіне баскаў мела даўнюю гісторыю. Аднак вялікіх паляванняў на ведзьм тут не было, акрамя эпізоду 1609–1611 гг. У першую чаргу гэта звязана з той роляй, якую адыгрывала тут інквізіцыя, і кантроль інквізіцыі над свецкімі судамі.***

Да Краіны баскаў належаць тэрыторыі па абодва бакі Пірэнеяў, г. зн. французская і іспанская часткі. Нягледзячы на вядомасць палявання на ведзьм сярод баскаў і наяўнасць вялікай колькасці дакументаў, навуковых прац па гэтай тэме не так многа. Дакументы французскіх судоў большай часткай страчаны, а іспанскія дакументы пакуль не даследаваны поўнасцю. У гэтым сэнсе найлепш сітуацыя выглядае для Навары, Памплоны і Лагроны. Рэплікі дакументаў іспанскіх судоў зараз знаходзяцца ў Нацыянальным гістарычным архіве ў Мадрыдзе.

Вера ў вядзьмарства сярод народа баскаў у Пірэнеях з'яўляецца адной з найлепш задакументаваных для Еўропы Ранняга Новага часу дзякуючы таму, што іспанская інквізіцыя праводзіла тут расследаванне ў сувязі з вядзьмаркамі Сугарамурдзі і творамі французскага дэманолага Пьера де Ланкра. Твор де Ланкра быў надзвычай папулярным, аднак на яго паўплывалі паляванні на ведзьм у Еўропе ў цэлым.

Інквізіцыя занатавала 410 спраў с 1538 па 1798 г. супраць розных магаў і вядзьмарак [1]. Таксама ёсць запісы свецкіх судоў XVI–XVII стст. Таксама былі справы паклёпу, г. зн. супраць тых, хто абвінавацію кагосьці ў ведаўстве. Так, пасля судоў 1609–1611 гг. многа мясцовых чыноўнікаў было выгнана за злоўжыванне ўладай. Аднаго са святароў пакараў епіскапскі суд за тое, што ён аб'явіў сябе паляўнічым на ведзьм і адмаўляў у прычашчэнні тым, хто падазраваўся ў ведаўстве [3].

Для баскаў вядзьмарства мела даволі доўгую гісторыю. Ёсць сведчанні пра суды над тымі, хто выконваў магічныя дзеянні яшчэ ў XIV ст. Усе абвінавачаныя былі жанчынамі. Упершыню слова *sorguina*, што ў баскаў азначала "ведзьма", зафіксавана ў справе пра паклёп у Памплоне ў 1415 г. [3, с. 18] У пачатку XV ст. французскія і іспанскія магістраты праводзілі тут суды. У 1466 г. правінцыя Гіпускоа звярнулася да Энрыке IV Касцільскага (1454–1474), каб ён прадпрыняў дзеянні супраць вядзьмарак, якія шкодзілі ў гэтым рэгіёне. Аўтары петыцыі скардзіліся, што ў мясцовых законах няма артыкулаў супраць вядзьмарства, і прасілі, каб кароль дазволіў мясцовым уладам судзіць і караць вядзьмарак і ведзьмакоў без права апеляцыі. Петыцыя была адобрана [4, с. 108–110].

Першым сапраўдным судом над ведзьмамі ў Навары лічыцца суд 1496 г. Праследаванні вядзьмарак, некаторыя былі вельмі суровымі, зафіксаваны ў іспанскай Правінцыі баскаў у 1507 г., калі спалілі каля 30 чалавек, а таксама ў 1517 і 1527 гг. У пачатку XVI ст. пра іспанскія суды над ведзьмамі пісалі такія іспанскія дэманолагі, як Марцін дэ Кастаньега ("Трактат пра забабоны і ведзьмаўства", 1529 г.) і Пэдра Сіруэла ("Аб забабонах і ведзьмаўстве", 1529 г.). Усё XVI стагоддзе з іспанскага боку Пірэнеяў моцнага праследавання ведзьм не было, асабліва пасля таго, як інквізіцыя змяніла свае працэдуры па расследаванню спраў вядзьмарства. Самымі моцнымі прыхільнікамі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

палявання на ведзьм сярод іспанскіх баскаў былі свецкія магістраты, але інквізіцыі ўдавалася ўтрымліваць кантроль над гэтым працэсам. Толькі некалькі судоў завяршыліся смяротным пакараннем.

Само насельніцтва, здаецца, падтрымоўвала паляванні на ведзьм. Напрыклад, сяляне-баскі збіралі грошы, каб запрасіць суддзю, які дапаможа разабрацца з ведзьмамі [2,с. 18].

Агрэсіўнае паляванне на ведзьм у Краіне баскаў у XVII ст. пачалося з французскага боку мяжы, калі мясцовыя чыноўнікі з Лабурдана звярнуліся да караля Францыі са сваёй скаргай на ведзьм і просьбай дапамогі. Гэта падзея пазней атрымала назву “Вялікае паляванне на ведзьм”, ці “Вялікая паніка ў Краіне баскаў”. У 1609 г. Генрых IV прызначыў юрыста П’ера дэ Ланкра і прэзідэнта парламента Бардо, вучонага Жана д’Эспанье правесці выязны суд. Дэ Ланкр, дамінуючая персона, і д’Эспанье пачалі сваю місію толькі летам 1609 г., але мясцовыя ўлады не чакалі. Яны ўжо судзілі ведзьм у вялікіх колькасцях. Дакладная лічба пакараных дэ Ланкрам ведзьм невядомая, але, напэўна, гэта было каля 80 чалавек, сярод іх некалькі святароў. Дэ Ланкр лічыў, што гэта толькі вярхушка айсберга, і вырашыў, что ўсё грамадства баскаў забруджана вядзьмарствам.

Калі дэ Ланкр прыбыў у Краіну баскаў, там ужо развярнулася сапраўдная істэрыя. Бацькі не спалі начамі і сачылі за дзецьмі, каб іх не забралі на шабаш. Адным з галоўных пачынальнікаў гэтага мясцовага палявання на ведзьм быў Трыстан дэ Гамбоа д’Альсатэ, дваранін. Ён асабіста адправіў некалькі жанчын у турму.

Французскае паляванне на ведзьм перайшло на іспанскі бок, у выніку пакаралі 6 ведзьм з Сугарамурдзі ў 1610 г. Прызнанні ведзьм, расследаваныя іспанскай інквізіцыяй, былі атрыманыя пад вялікім псіхалагічным ціскам, але без катаванняў, яны з’яўляюцца самай дэталёвай крыніцай уяўленняў баскаў аб вядзьмарстве і высока ацэньваюцца гісторыкамі-даследчыкамі. Ведзьмы Сугарамурдзі расказвалі пра тайнае аб’яднанне тых, хто пакланяўся Д’яблу. Д’ябал мог з’явіцца ў выглядзе страшнага чалавека з дэфармаваным целам і жудаснымі вачыма, а часам у выглядзе казла. Для апісання шабаша баскі выкарыстоўвалі слова *akellarre*, што літаральна азначае “казліны луг”. Аднак у апошні час выказваюцца сумненні ў адносінах такога разумення. Антраполаг Мікель Асурмендзі сцвярджае, што правільным перакладам будзе “луг з кветкамі *alka*”. Гэта атрутная расліна, ад якой хварэюць каровы, калі з’ядуць яе. Магчыма, гэта прыклад памылкі перакладу ў час допытаў, таму месца, дзе, як лічылі, збіраліся ведзьмы Сугарамурдзі, інквізітары зразумелі як шабаш з Д’яблам-казлом на чале. У крыніцах да 1609 г. шабашы называлі *ayuntamientos* (асамблеі), *conjunta mientos* (сабранні), *conventícu los del demonio* (д’ябальскія малельні) і *congregaciones del cabrón* (асамблеі казла).

Шабашы адбываліся часта: кожны панядзелак, сераду і пятніцу, а таксама вечарамі ў дні вялікіх царкоўных святаў. Яны пачыналіся позна вечарам і ішлі да ўсходу сонца. Перад тым як адправіцца на шабаш, ведзьмы націраліся ванючай маззю, паўтараючы словы вернасці Д’яблу. Яны маглі ляцець ці ісці на шабаш. Там яны падалі ніц перад Д’яблам, цалавалі яго рукі, грудзіну, пеніс і анус. Галоўнымі заняткамі на шабашы былі танцы і сэкс паміж людзьмі і людзьмі і Д’яблам. Таксама ведзьмы балявалі чалавечынай. Вельмі яскравыя апісанні шабаша баскаў паўплывалі на астатнюю Еўропу пасля таго, як іх апублікавалі ў кнізе дэ Ланкра “Апісанне зменлівасці злых анёлаў і дэманаў” (1612). Перад святамі ведзьмы і Д’ябал праводзілі спецыяльную цырымонію – пародыю на каталіцкую службу.

Вядзьмарства сярод баскаў было прадстаўлена як традыцыя, якую перадаюць у сям’і, а не непасрэдна набор Д’яблам ведзьм сабе на службу. Баскскія ведзьмы казалі, што яны прайшлі абрад ініцыяцыі ў дзяцінстве, калі дарослыя ведзьмы, часта іх бацькі, пераконвалі іх адмовіцца ад Бога і святых і перайсці да Д’ябла. Д’ябал пакідаў кіпцюрамі сваю метку. Ведзьмы былі арганізаваны ў іерархію, большай магутнасцю і адказнасцю надзяляліся старэйшыя ведзьмы. Асабліва значныя ведзьмы былі каралевай ці каралём шабашу.

Краіна баскаў – гэта адзінае месца ў Еўропе, дзе вера ў фамільяраў іграла вялікую ролю ў паляваннях на ведзьм. У якасці фамільяраў у баскаў былі жабы, якіх вельмі цанілі. Звычайныя жабы былі інгрыдыентам у атрутах і мазях, якія рабілі ведзьмы. Як і паўсюль, баскскія ведзьмы павінны былі наносіць шкоду, і Д’ябал караў іх, калі яны гэтага не рабілі.

У кожнай вёсцы, якую ахапіла паніка, можна назіраць аднолькавую мадэль. Паніка пачыналася з расказаў пра тое, што адбывалася ноччу ў час сна. Вялікая колькасць людзей, у асноўным дзеці і падлеткі, расказвалі, што пакуль яны спалі, іх адносілі на начны шабаш ведзьм. Гэтыя сны былі настолькі яскравымі, што іх цяжка было адрозніць ад рэальнасці. Пасля гэтых аповедаў і пачыналася паніка. Але сны не вялі напрамую да абвінавачванняў. Толькі пазней дзеці пачалі называць тых, хто адносіў іх на шабаш.

Паўсюль, дзе назіралася паніка, мы бачым тры кампаненты: ідэалагічная апрацоўка, эпідэмія сноў і прымусовае прызнанне. Жыхары вёскі выкарыстоўвалі ўсе магчымыя формы катаванняў, каб атрымаць прызнанне. Зімой 1610–1611 гг. з-за дзенняў жыхароў горных вёсак Навары загінула некаторая колькасць людзей (дакладных лічбаў няма). Да сакавіка 1611 г. інквізіцыя атрымала 1946 імёнаў ведзьм, пасля чаго было прызначана расследаванне.

Цяжка сказаць, што з прызнанняў баскскіх ведзьм – гэта сапраўдныя вераванні баскаў, а што – дэманалагічныя чаканні інквізітараў і магістратаў. Гэта пытанне абцяжарваецца культурным і лінгвістычным бар’ерам паміж баскамі, французамі і іспанцамі. Мала хто з інквізітараў і чыноўнікаў разумеў мову баскаў, а баскі, у сваю чаргу, не разумелі іх без перакладчыка. Суддзі часта бачылі ў характэрных культурных практыках баскаў вядзьмарства. Дэ Ланкр, у прыватнасці, быў абураны высокім статусам жанчын у баскаў. Праблему праўдзівасці прызнанняў выказаў інквізітар Алонса дэ Саласар. Саласар праводзіў сваё расследаванне ў 1610–1612 гг., у яго ўваходзілі і пошукі ў дамах ведзьм розных прылад, атрут і фамільяраў, дзе нічога не знайшлі. Таксама ведзьм з завязанымі вачыма прывозілі на месцы, дзе, як яны казалі, адбываўся шабаш, прасілі апісаць іх, а затым параўноўвалі з апісаннямі іншых, тых, хто быццам іх наведваў. Фізічны агляд некаторых жанчын, якія заяўлялі, што мелі сэксуальныя адносіны з Д’яблам, паказаў, што яны былі цнатлівымі дзяўчатамі. Вярхоўны савет іспанскай інквізіцыі прызнаў доказы Саласара, і гэта прывяло да змяншэння праследавання ведзьм на іспанскім баку Краіны баскаў. Цяпер іх праводзілі свецкія ўлады, а інквізіцыя перашкаджала ім. Пасля дэ Ланкра і на французскім баку паляванняў стала менш. З другога боку, вера ў вядзьмарства захоўваецца ў Краіне баскаў і па сённяшні дзень.

Менавіта падзеі ў Краіне баскаў былі адным з фактараў, якія фарміравалі палітыку іспанскай інквізіцыі ў дачыненні да ведзьм. На інквізіцыю ўплывала неасхаластычная традыцыя іспанскіх універсітэтаў, а гэта не давала замацавацца ў Іспаніі дэманалогіі Паўночнай Еўропы, якая складвалася пад уплывам неаплатанізму. Краіна баскаў стала выключэннем, таму што інквізітары былі пад французскім уплывам. Аднак дзякуючы крытыцы і расследаванню Саласара даўняя практыка інквізіцыі не спальваць ведзьм была адноўлена, што было замацавана ў інструкцыях 1614 г.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Henningsen, G.The Database of the Spanish Inquisition. The'relaciones de causas’-project revisited / G.Henningsen // Vorträgezur Justizforschung: Geschichte und Theorie. Edited by HeinzMohnhaupt and Dieter Simon. – Frankfurt am Main: Max-Planck-Institut für Europäische Rechtsgeschichte, 1992. – Pp. 43 – 85
2. Henningsen, G. The Witches’ Advocate: Basque Witchcraft and the Spanish Inquisition / G. Henningsen. – Reno: University of Nevada Press,. 1980. – 607 p.
3. Idoate, F. de. La brujería en Navarra y sus documentos / F. de. Idoate. – Pamplona: Institución Príncipe de Viana, 1978. – 478 p.
4. Orella Unzue, J. L. Cartulario Real de Enrique IV a la provincia de Guipúzcoa (1454–1474) / J. L. Orella Unzue. – San Sebastián: Sociedad de Estudios Vascos, 1983. – 196 p.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова